# "LOMOўсход"

Аўтобус мінаваў вясковыя хаты, прыпынкі мінулай эпохі. Нечакана перад маімі вачамі ўстаў вялікі інструмэнтальны цэх! Над брамай зьзяў выцьвілымі фарбамі характэрны надпіс - КАМБІНАТ. Пстрык! І вось мой маленькі савецкі апарацік ЛОМО ЛЦ-А зафіксаваў першы адбітак. Украіна, 2004г.



З таго часу мой "ЛОМКА" пачаў часта зьмяняць месцазнаходжаньне: з шуфляды - да кішэні штаноў. Калі наступным разам (на ўсялякі выпадак) узяў яго ў падарожжа па Беларусі, толькі калі вярнуўся і праявіў стужкі, ўсьвядоміў, якую вартасьць маюць тыя здымкі... Дзьве стужкі, дзьве пратэрмінаваныя стужкі...

"ЛОМКА" фіксуе тое, чаго не заўважыш у добрым кадры. На першы погляд здымкі атрымліваюцца памылковыя: неахайныя, нярэзкія, маюць адарваныя ад рэчаіснасьці колеры. Але калі я параўнаў іх са сваімі адчуваньнямі і перажываньнямі, адбіткі ажылі, набралі сэнсу, далі шмат радасьці і зачаравалі той магіяй, якой рашуча не стае, калі ўжываеш звычайны лічбавік. Вось чаму LOMOздымкі зьяўляюцца найлепшай памяцьцю падчас падарожжаў. Вандруючы па Усходняй Эўропе, намагаюся чэрпаць энэргію з кожнага элемента, які характэрызуе той рэгіён, падкрэсьлівае клімат тых мясьцінаў.



Нягледзячы на тое, што атрымленныя фотакарткі не пасуюць па нормах і правілах да "ідэальнага" фота, калі ў іх добра ўгледзецца, складаецца ўражаньне суцэльнай карціны мінулай эпохі, якая нават у Беларусі паволі канае на карысьць новага часу. Помнік Ільічу, савецкае аўто, бэтонны спальны раён, мінакі, зруйнаваная фабрыка, кіёск, багна, ці па просту Я ТАМ, - вось тыя элементы, што ствараюць магічны сьвет LOMOўсходу і займаюць важнае месца ў фармаваньні маёй сьвядомасьці, дапамагаюць асэнсаваць культуру і гісторыю цяпер ужо незалежных дзяржаваў Беларусі дый Украіны.



Так, усё нашае жыцьцё - суцэльны адбітак. Адбітак часу. Усходні час нібыта крыху спазьняецца - чым не машына часу?!!

Пазбаўцеся стэрэатыпаў, далучайцеся да майго стылю жыцьця!